# ЗАХОЎВАЦЬ І БЕРАГЧЫ



*Ад усёй душы шчыра віншую ўсіх сваіх калег з прафесійным святам — Днём бібліятэк. Да яго ў гэтым годзе прымеркаваны 85-гадовы юбілей галоўнай бібліятэкі раёна. Дзякуй усім за самаадданасць выбранай прафесіі, за сапраўдную любоў да Кнігі, якая для кожнага разумнага чалавека — мудры дарадца і сябра, скарбніца і вялікая школа жыцця.*

*Галіна КАЗЛОВІЧ.*

## Стваральнік усяго — калектыў

На думку тых, хто калі-небудзь пабываў у Міханавічах, ды і мясцовых жыхароў, месца знаходжання галоўнай бібліятэкі Мінскага раёна — цэнтральнай — у поўнай меры можна лічыць ландшафтнай славутасцю аграгарадка. Чаго толькі варты і яблыневы сад, што нявесціцца кожную вясну, і цудоўнай прыгажосці кветкавыя кампазіцыі, што ўпрыгожваюць тэрыторыю, і своеасаблівыя архітэктурныя вырабы з дрэва і іншых прыродных матэрыялаў. З любоўю і густам зробленае афармленне — дастойная знешняя аправа жамчужыне мудрасці і ведаў, якой спакон вякоў была Кніга. Цэнтральная раённая бібліятэка ў гэтым годзе адзначае сваё 85-годдзе. Увесь час станаўлення, без малога стагоддзе, многія, многія людзі, што працавалі і працуюць у сучаснай бібліятэчнай сістэме, верай і праўдай служылі Яе Вялікасці Кнізе, аддаючы ёй апантаную працу, пяшчоту, беражлівасць адносін да каштоўнага кніжнага скарбу, які павялічваўся з гадамі, набываў рысы сучаснасці і прывабнасці.

**Мінская цэнтральная раённая бібліятэка — метадычны цэнтр для абслугоўвання бібліятэк прысталічча, жыхароў аграгарадка Міханавічы і дзевяць населеных пунктаў Міханавіцкага сельсавета.**

Мінская раённая цэнтральная бібліятэка ўжо ў гэтым годзе стала пераможцам штогадовага абласнога агляда-конкурса "Лучшее информационно-идеологическое оборудование и оформление объектов агитационно-идеологической работы среди организаций культуры" у намінацыі "Лучший информационный уголок (информационный стенд)".

**З дырэктарам цэнтральнай раённай бібліятэчнай сістэмы Г.А.Казловіч гутарым напярэдадні прафесійнага свята. Яна кіруе сістэмай больш пятнаццаці гадоў, узначаліўшы МЦРБ ў** 1993 годдзе. Смех скрозь слёзы пры ўспамінах, колькі прыйшлося перанесці, колькі ўкласці сіл і намаганняў, каб наладзіць сапраўдны творчы працэс. І аддаю даніну сціпласці дырэктара. Яна ні ў якім разе не хоча згаджацца з тым, што сённяшняя высокая ацэнка дзейнасці галоўнай бібліятэкі раёна ў большай ступені яе заслуга. Увогуле рэдка сустракала такіх самаадданых справе людзей, кіраўнікоў, якія ў выніку змаглі стварыць адзіны калектыў супрацоўнікаў-патрыётаў. Асабліва гэта датычыць старэйшых работнікаў бібліятэкі. Менавіта яны перажылі разам з кіраўніком усе цяжкасці.

— Стваральнік усяго — калектыў, — заява дырэктара катэгарычная. — Дарэчы, сёння і старэйшыя супрацоўнікі бібліятэкі, і маладыя нашы калегі робяць усё, каб людзі назаўсёды пасябравалі з кнігай, — дадае Галіна Аляксандраўна.




*(справа налева) намеснік дырэктара Святлана СЕДЛЯРОВА і інспектар аддзела кадраў Святлана КОЎЗЕЛЕВА.*

Наогул, у складаных сацыяльна-эканамічных умовах бібліятэка зберагае галоўны прынцып сваёй дзейнасці: свабодны доступ да інфармацыі, бясплатнае бібліятэчнае абслугоўванне, далучэнне людзей да каштоўнасцей нацыянальнай і сусветнай культуры.

**У сістэме Мінскай раённай цэнтральнай бібліятэкі працуе пяць перасоўных бібліятэчных пунктаў выдачы кніг.**

Сучасная структура бібліятэкі падзелена на сем аддзелаў. Кожны са сваёй спецыфікай: чытальная і дзіцячая залы, абанемент, аддзелы даведачна-інфармацыйны, бібліятэчнага маркетынгу, камплектавання, абслугоўвання, кнігасховішча. З'явіліся і новыя віды паслуг, платныя ў тым ліку, што сёння эканамічна неабходна для больш менш нармальнага існавання.

Асабліва важна тое, што відавочна змяняецца практыка работы з чытачамі. Тут адыходзяць ад стэрэатыпаў, робяць усё, каб кожны наведвальнік імкнуўся да асэнсавання свайго месца і ролі ў грамадстве. Вызначыліся і прыярытэты, па-



*Загадчыца матэрыяльна-тэхнічным забеспячэннем Аксана Канстанцінаўна РАМАНЮК.*

вялічваюцца інфармацыйныя магчымасці, узрастае якасць абслугоўвання.

На змену іміджу бібліятэкі, яе дзейнасці паўплывала ўкараненне новых тэхналогій, аўтаматызацыя бібліятэчных працэсаў, якія ажыццяўляюцца згодна з праграмай "Інфарматызацыя і камплектаванне фондаў публічных бібліятэк Мінскай вобласці да 2010 года". Наколькі скараціўся шлях да ведаў пры аўтаматызацыі асноўных бібліятэчных працэсаў!

Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі дапамагаюць вырашаць праблему аператыўнасці, эфектыўнасці, паўнаты, дазваляюць кардынальна пашыраць спектр дакументаў і інфармацыі, паскорыць іх прадастаўленне карыстальнікам.

Шмат гадоў у раённай цэнтральнай бібліятэцы працуе цэнтр прававой інфармацыі. Яго асноўная функцыя — задавальненне запытаў чытачоў у прававых ведах. Для гэтага выкарыстоўваюцца рэсурсы на розных носьбітах. Цэнтр забяспечаны электроннай копіяй банка даных прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь "Эталон". Аднаўленне базы даных тут праводзіцца штоквартальна.

Я ўпэўнена ў адным, што напоўніць, здавалася, спакойную, немітуслівую бібліятэчную справу глыбокім сэнсам і разнастайнасцю могуць толькі зацікаўленыя людзі. Інакш чым можна растлумачыць вялікую тэматычна мэтанакіраваную работу ў ЦРБ па задавальненню запытаў чытачоў, арганізацыю іх чытальніцкай дзейнасці, развіццё творчых здольнасцей. Тут вызначаецца шэраг прыярытэтных

### аддзел камплектавання і апрацоўкі літаратуры

**Загадчыца Таццяна Валянцінаўна БАГАТЫР:**



*— Галоўны напрамак дзейнасці аддзела — задавальненне запытаў чытачоў. Дарэчы, сёння кожны наведвальнік можа заказаць любую літаратуру і амаль ніколі не было такого, каб не змаглі выдаць чытачу запатрабаванае выданне. Кніжны фонд дапамагаюць папаўняць райвыканкам, спонсары, чытачы, якія прымаюць штогод актыўны ўдзел у акцыі "Падаруй кнігу бібліятэцы".*

*Імкнемся абавязкова знайсці літаратуру, якая зацікавіла б таго ці іншага чытача. Дапамагае і ўнутрысістэмны, і міжбібліятэчны абмены.*

*(злева направа) Іна ЯВОРСКАЯ, Наталля НОСАВА, Таццяна БАГАТЫР, Вераніка ТАРАБЕНКА.*

Прысталічча. – 2009. – 12 верасня. – С.4 - 5.